Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ: зб.навук.арт.памяці праф.В. У. Протчанкі / пад рэд. Л. А. Мурынай. – Мінск: Беларус.дзярж. ун-т, 2002. – Вып.1.

*І. М. Саматыя*

# ШЛЯХІ РЭАЛІЗАЦЫІ АНТРАПАЦЭНТРЫЧНАГА ПАДЫХОДУ ПРЫ НАВУЧАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (НА МАТЭРЫЯЛЕ 8 КЛАСА)

Антрапацэнтрычная канцэпцыя галоўным прадметам вывучэння лічыць моўную асобу – вучня, які гаворыць, піша, чытае, успрымае, яго маўленчыя і разумовыя здольнасці параджаць і ўспрымаць маўленчыя выказванні [1, с. 42]. Пры навучанні мове нельга абмяжоўвацца рамкамі сістэмнай прэзентацыі самой мовы, аналізам моўнай матэрыі ў адрыве ад сацыяльнай практыкі. Ведаць мову неабходна для таго, каб пазнаць свет, культуру народа, каб валодаць ёю як сродкам зносін і свабодна інтэгравацца ў розныя сферы жыццядзейнасці.

Любы аналіз слоў, сказаў, тэкстаў на ўроку пачынаецца з чытання ці праслухоўвання моўнага матэрыялу. Пісьмовы тэкст толькі тады становіцца крыніцай пазнання, калі індывід валодае маўленчай здольнасцю яго асваення. А гэта значыць, што навучанне чытанню, абуджэнне цікавасці да кнігі, адчуванне патрэбы ў ёй становіцца адной з галоўных задач адукацыі.

Як слушна сцвярджае В. У. Протчанка, “правільна наладжанае чытанне разглядаецца як перадумова аналізу, сродак нагляднасці, крыніца ведаў аб сусвеце і людзях, іх паводзінах, марах і ўчынках, спосаб разумовага развіцця і выхавання школьнікаў” [2, с. 122].

На жаль, як паказвае школьная практыка, у сярэдніх класах настаўнікі надаюць чытанню і працы з тэкстам значна менш увагі, чым у малодшых. А, як вядома, навыкі розных відаў чытання – праглядальнага, азнаямляльнага, вывучальнага – фарміруюцца вельмі павольна і патрабуюць сістэматычнай працы. У раздзеле “Навучанне аналізу тэксту, асэнсаванне моўных фактаў і з'яў, удасканаленне чытацкіх навыкаў – узаемазвязаныя бакі цэласнага працэсу” цытаванай вышэй манаграфіі прафесар В. У. Протчанка адзначае, “што зараз настаўніку самому даводзіцца і падбіраць і арганізоўваць працу” [2, с. 123] з тэкстамі, менавіта гэтыя пытанні ў методыцы выкладання мовы распрацаваны недастаткова.

Думаецца, што цяпер, калі рыхтуюцца вучэбна-метадычныя комплексы па беларускай мове, неабходна ўключаць у іх матэрыялы, якія дазвалялі б настаўнікам-мовазнаўцам вырашаць комплексныя задачы, акрэсленыя праграмай, у тым ліку і ў навучанні чытанню.

Праграмай 8 класа па беларускай мове прадугледжана падрыхтоўка паведамленняў на лінгвістычную тэму: “Рыхтаваць паведамленне, звязанае з тэмай “Сінтаксіс і пунктуацыя” [3, с. 49–50]. Паколькі падручнікі па беларускай мове для 8 класа [4] не змяшчаюць звестак пра беларускіх

лінгвістаў, то ў дыдактычны матэрыял для гэтага класа [5] уключаны наступныя практыкаванні:

*№ 1. Разгледзьце ўважліва тэксты (не чытаючы іх). Чым яны адметныя? З якіх частак складаюцца? Чаму ў іх выкарыстаны розныя шрыфты? Прачытайце тэксты. Вызначце іх адрасата і стыль. Якую інфармацыю вы атрымалі з тэкстаў?*

1. Беларускі мовазнавец Л. І. Бурак нарадзіўся 23 сакавіка 1930 г. у в. Кулышыно Вілейскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт БДУ (1953). Працаваў у Інстытуце мовазнаўства АН БССР, з 1966 г. – у БДУ. Доктар філалагічных навук (1980), прафесар (1982). Заслужаны работнік народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь (1990). Даследаваў сінтаксіс беларускай мовы. Памёр у 1997 годзе.

Тв.: Пунктуацыя беларускай мовы. 3-е выд. Мн., 1982; Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя. Мн., 1987; <…> Роля злучніка ***ды, і*** ў простым сказе // Весн. БДУ. Сер. 4. 1980. № 1.

(Н. С. Мажэйка)

2. Беларускі мовазнавец В. У. Протчанка нарадзіўся 7 красавіка 1930 г. у в. Зарэчча Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. У 1958 г. скончыў Мазырскі педінстытут. Доктар педагагічных навук (1990), прафесар (1993). <…>

Прадмет яго навуковых пошукаў: удасканальванне мэт і задач навучання. <…> Даследуючы праблемы школьнага сінтаксісу, В. У. Протчанка падкрэслівае, што актывізацыі мыслення і маўлення дзяцей спрыяюць менавіта сінтаксічныя ўменні і навыкі, якія выпрацоўваюцца пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм курса роднай мовы.

Тв.: Вывучэнне сінтаксісу простага сказа. Мн., 1973; Вывучэнне сінтаксісу словазлучэння і двухсастаўнага сказа ў 5 класе сярэдняй школы. Мн., 1991; Аб практычнай накіраванасці школьнага курса беларускай мовы // Выкладанне беларускай мовы і літаратуры. Мн., 1983.

(Я. М. Лаўрэль)

- *Звярніце ўвагу на знакі <…>, //. Якую функцыю яны выконваюць у навуковым тэксце?*
- *Падрыхтуйце публічнае выступленне (навуковае паведамленне, звязанае з тэмай "Сінтаксіс і пунктуацыя" ці "Беларускія даследчыкі ў галіне сінтаксісу і пунктуацыі").*

*№ 2. Уважліва разгледзьце наступны тэкст. З якіх частак ён складаецца? Вызначце яго стыль. Якія моўныя канструкцыі выкарыстаны? Чаму? Якую інфармацыю вы атрымалі з тэксту?*

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Беларуская мова, літаратура, мастацтва
Рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік
Мінск 1996

Змест

Уступ…………………………………………………………… 3
Мова…………………………………………………………… 5
З гісторыі і сучаснасці………………………………………… 8
Культура мовы. Дапаможнікі………………………………… 12
Слоўнікі. Размоўнікі…………………………………………... 16
Літаратура……………………………………………………... 18
Проза…………………………………………………………… 28
Творы на беларускай мове……………………………………. 36
Творы на рускай мове………………………………………… 40
Паэзія…………………………………………………………... 45

Драматургія………………………………………………………. 47
Фальклор…………………………………………………………. 49
Дапаможныя паказальнікі. Паказальнік аўтараў і назваў мастацкіх твораў, прац па літаратуразнаўстве і мовазнаўстве………………… 50
Імянны паказальнік………………………………………………… 53
Тэматычны паказальнік…………………………………………… 59

- *Якія бібліяграфічныя паказальнікі вы ведаеце?*
- *Пісьмова запішыце сваімі словамі ўсё, пра што расказала вам гэта старонка з бібліяграфічнага паказальніка. Чым адрозніваецца тэкст-пераказ ад тэксту арыгінала?*

*№ 3. Уважліва разгледзьце старонку з бібліяграфічнага паказальніка “Беларуская мова, літаратура, мастацтва". З якіх частак складаецца тэкст? З дапамогай настаўніка прачытайце першы абзац тэксту. Чаму ў ім выкарыстаны скарочаныя формы слоў? Якія знакі прыпынку выкарыстаны і чаму?*

**Мова**
**З гісторыі і сучаснасці**

*1. Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А. Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭН, 1994. – 665 с.: іл.*

Энцыклапедыя беларускай мовы – першае выданне такога тыпу ў гісторыі нацыянальнай культуры. Яна змяшчае звесткі пра гісторыю мовы, яе пісьмовыя і друкаваныя помнікі, структуру, граматычны лад і сучасны стан, пра айчынных і замежных даследчыкаў беларускай мовы. Не падмяняючы акадэмічных граматык, энцыклапедыя дае дастаткова падрабязную характарыстыку функцыяніравання літаратурнай мовы, разнастайныя звесткі аб народна-гутарковай мове, мове выдатных беларускіх паэтаў і празаікаў. Разглядаецца праблематыка культуры вуснага і пісьмовага маўлення, станаўлення і пашырэння літаратурных нормаў у галіне правапісу, стылістыкі, арфаэпіі. Энцыклапедыя мовы – частка энцыклапедыі беларусазнаўства.

Рэц.: *Крэнь І.* “Давайце парадуемся таму, што зроблена”: Прэзентацыя энцыкл. “Беларуская мова" // Наша слова. 1995. 17–31 траўня (№ 20/22). С. 9, 10. *Schuppe S.* Заўчасны плён // Наша Ніва. 1995. № 2. С. 2–3.

- *Што сабой уяўляе другі абзац тэксту? Якую інфармацыю вы атрымалі з анатацыі да энцыклапедыі “Беларуская мова”? Чаму трэцяя частка тэксту набрана меншым шрыфтам? Якую інфармацыю вы атрымалі з гэтай часткі?*
- *Ці знаёмы вы з газетамі “Наша слова”, “Наша ніва”?*

Такога тыпу практыкаванні дазваляюць выпрацоўваць у школьнікаў навыкі чытання розных відаў, навыкі самастойнага здабывання ведаў, развіваюць лінгвістычны светапогляд, адным з кампанентаў якога з'яўляецца інфармацыя аб лінгвістах. Такая інфармацыя – у першую чаргу пра айчынных мовазнаўцаў – дазваляе ўбачыць традыцыйны школьны прадмет у асобах.

Працу ў гэтым напрамку можна прадаўжаць і на іншых уроках, напрыклад нават на ўроку кантролю ведаў, уменняў і навыкаў, калі ў якасці дыдактычнага матэрыялу прапаноўваць інфармацыйна насычаныя тэксты вядомых мовазнаўцаў:

*№ 1. Размеркаваць злучальныя злучнікі пры аднародных членах па адпаведных групах. Дапісаць, калі патрэбна, свой прыклад.*

1. Энцыклапедыя дапаможа разабрацца ў такіх нялёгкіх пытаннях, як узаемадзеянне мовы і грамадства, мовы і культуры, мовы і літаратуры, логікі і мовы.

2. Дзякуючы апісваемай кнізе наш сучаснік, будучыя пакаленні даведаюцца аб тым вялікім укладзе, які ўнеслі ў развіццё беларускай літаратурнай мовы, а таксама ў сусветную культуру творы, напісаныя нашымі суайчыннікамі.

3. Пры неабходнасці чытач знойдзе ў энцыклапедыі дастаткова поўныя звесткі аб перыядычных выданнях, у якіх асвятляюцца ці асвятляліся пытанні функцыянавання беларускай літаратурнай мовы.

4. У прапанаванай чытачу кнізе размова ідзе не столькі пра навукоўцаў і мову наогул, колькі пра мову канкрэтную, жывую, а не мёртвую, натуральную, а не штучную.

(В. Протчанка)

Спалучальныя _____________
Супраціўныя ______________
Размеркавальныя ___________

*№ 2. Знайсці памылкі ў пастаноўцы знакаў прыпынку.*

1. Карысная, змястоўная, і цікавая кніга “Беларуская мова. Энцыклапедыя", якая выйшла пад рэдакцыяй доктара філалагічных навук, прафесара А. Я. Міхневіча.

2. Па сутнасці гэта настольная кніга для вучоных, выкладчыкаў ВНУ, студэнтаў, вучняў агульнаадукацыйных школ і іншых навучальных установ: для ўсіх тых, хто цікавіцца беларускім словам.

3. Шмат увагі надаецца знаёмству з жыццём і культурна-асветніцкай працай выдатных дзеячоў даўніны і сучаснасці – Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага, Мялеція Сматрыцкага, Лаўрэнція Зізанія, Браніслава Тарашкевіча, Язэпа Ластоўскага, Фёдара Янкоўскага, Льва Шакуна, Леаніда Бурака і інш.

(В. Протчанка)

Такім чынам, шляхі рэалізацыі антрапацэнтрычнага падыходу пры навучанні мове могуць быць разнастайнымі, але неабходна паклапаціцца, каб гэта было закладзена ў навучальныя дапаможнікі.

## ***Літаратура***


1. Выкладанне беларускай мовы ў школе // М. Г. Яленскі, Л. С. Васюковіч, І. М. Саматыя і інш. Мн., 1994.

2. *Протчанка В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. Мн., 2001.

3. Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова: 5–11 классы. Мн., 2000.

4. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8-га кл. шк. з беларус. мовай навучання / Л. А. Антанюк, З. І.Бадзевіч, М. В. Кныш, І. М. Саматыя. Мн., 2000.

5. *Бадзевіч З. І., Саматыя І. М.* Дыдактычны матэрыял па беларускай мове: 8 кл. Мн., 2002.